# Падагульненне вывучанага па тэме “Назоўнік”

**Л. Г. Самкевіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры,
СШ № 3 г. Пінска

Урок “Падагульненне вывучанага па тэме “Назоўнік”. Марфалагічны разбор назоўніка” праводзіцца пасля вывучэння тэмы “Назоўнік”. Каб абудзіць цікавасць вучняў да беларускай мовы, на ўроку былі выкарыстаны розныя эфектыўныя метады і прыёмы навучання, накіраваныя на развіццё творчых здольнасцей навучэнцаў. Адным з прыярытэтных кірункаў вучэбных заняткаў па беларускай мове з’яўляецца далучэнне школьнікаў да духоўных каштоўнасцей беларускага народа, фарміраванне жадання шанаваць традыцыі і культуру роднага краю.

Для дасягнення пастаўленных мэт вучням быў прапанаваны ўрок-падарожжа.

**Мэты:**

1) арганізаваць кантроль за ступенню засваення вучнямі тэмы “Назоўнік”;
2) стварыць умовы для свабоднага аперавання засвоеннымі ведамі па тэме “Назоўнік”;
3) садзейнічаць развіццю лагічнага мыслення, рэалізацыі творчых здольнасцей вучняў;
4) выхоўваць цікавасць да духоўнай спадчыны беларусаў.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Падагульненне вывучанага матэрыяла.**

*Настаўнік.* Добры дзень, дзеці! У нас незвычайны ўрок. Сёння мы з вамі адправімся ў цікавую і чароўную краіну. І кожны з нас павінен праявіць сваю кемлівасць, дапытлівасць і ўменні на ўроку. Але тэму ўрока трэба сфармуляваць вам, звярнуўшыся да крыжаванкі. Выдзеленае слова стане ключавым да нашага ўрока.

- А пачаць нашу працу я хачу з загадкі. Уважліва слухайце. Ітак, наш **першы прыпынак “Загадка”:**

Што гэта за краіна такая?
Імя ўсё навокал тут мае:
Рачулка, расінка і зорка,

Пчала, аблачынка, вавёрка,
Дажджынка, сунічка, буслянка,
Бярозка, узгорак, палянка.
Па гэтай краіне нямала
З настаўніцай вы кіравалі.
Вы хуценька ўсе ўспамінайце
І назву яе адгадайце.
З дапамогай вось гэтай крыжаванкі.




**Па гарызанталі:**

1. Галоўны член сказа.
2. Раздзел навукі аб мове, у якім словы вывучаюцца як часціны мовы.
3. Даданы член сказа.
4. Ён бывае мужчынскі, жаночы, ніякі і агульны.
5. Раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца способы ўтварэння слоў.
6. Змяненне часцін мовы па склонах.
7. Ён можа быць і адзіночным і множным.
8. У беларускай мове іх шэсць.

**Па вертыкалі:**

**9.** Ключавое слова.

**Адказы**

*Па гарызанталі:* 1 – Дзейнік; 2 – Марфалогія; 3- Азначэнне; 4 – Род; 5 – Словаўтварэнне; 6 – Скланенне; 7 – Лік; 8 – Склон. *Па вертыкалі:* 9 – Назоўнік.

- Ці правільна напісана слова “назоўнік”? Чаму ў гэтым слове неабходна пісаць літару “Ў”? (*Пасля галосных пішацца Ў*).
- Такім чынам, тэма нашага ўрока – (*вучні вызначаюць тэму і мэты ўрока*).

1. Паўтарыць.
2. Прывесці ў сістэму.
3. Прымяніць правілы ў практычнай дзейнасці.

*Настаўнік.* - А каб нам утульна сёння было падарожнічаць, трэба каб наш шлях асвятляла сонейка, саграваала сваім цяплом, дапамагала нам. Таму да ўрока эпіграфам я ўзяла наступныя радкі (*напісана на дошцы*):

Пад сонцам добра нам жывецца,
Пад сонцам звонкі дзён разгон,
Пад сонцам цэлы свет смяецца,
Пад сонцам дружбай моцны ён.

Е. Янхтур

- Вызначце, якой часцінай мовы з'яўляецца слова "сонца"?
- Як вы разумееце значэнне слова "разгон" – (*напісаць на дошцы*) (разгон – разбег, рух з паступова нарастаючай скорасцю). Якія сінонімы можна падабраць да слова разгон? (*Шырыня, размах.*)

**Заданне: 1.**

- Вызначыць род, лік, скланенне назоўнікаў і паставіць іх у Р., Д. і М. склонах.

1 група – сонца; 2 група – разгон; 3 група – дружба.

- Ад чаго залежыць правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў. А якія бываюць асновы назоўнікаў?

А мы далей працягваем падарожжа.

**Заданне 2.**

Падарожжа – вельмі цікавы адпачынак. Яно дапамагае людз… спазнаць свой край, пазнаёміцца з яго прырод…, са звыча… і абрада….

1 група. Вызначыць марфемныя часткі слова "падарожжа".

2 група. Дапісаць канчаткі ў выдзеленых словах, растлумачыць іх.

3 група. Вызначыць лік падкрэсленых назоўнікаў і ад іх утварыць адваротны лік.

Вывад: назоўнікі бываюць адзіночнага і множнага ліку. Прывядзіце прыклады назоўнікаў, якія ўжываюцца толькі ў адзіночным, або толькі ў множным ліку.

За працай мы не заўважылі, як апынуліся на **прыпынку "Скарбонка мудрасці"**.

**Заданне 3.**

- Добраму госцю вароты самі расчыняюцца. Хто пільнуе свята, у таго пустая хата. На тым месцы, дзе хочаце будаваць новую хату, пастаўце гаршчочак з павуком. Калі за ноч павук пачне "ткаць кросны", то месца пад хату абрана добрае.

1 група. Выпішыце назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку.

2 група. Выпішыце два адушаўлёныя назоўнікі (*госць, павук*) і пастаўце іх у форме Р. і М. склонаў.

3 група. Выпішыце два неадушаўленыя назоўніка і пастаўце у Р. і М. склонах.

**Заданне 4.**

1 група. Пералічыце назвы народных святаў (3-5), якія адзначалі нашы продкі.

2 група. Пералічыце абрады і звычаі, якія існавалі ў нашых продкаў.

3 група. Адкажыце, з якой літары пішуцца ўласныя назоўнікі? Агульныя? Што яны абазначаюць?

А зараз мы апынімся на **прыпынку "Шчасця"** і крыху адпачнем.

**Заданне 5.** Трэба рассяліць жыхароў з верша ў шэсць дамоў.

Сонейка свеціць ад ранку да вечара.
Сонейка грэе ад ранку да вечара.
Хоча яно, каб шумелі сады,
Каб у садах спелі плады,
Каб колас у полі хіліўся к раллі,
Каб травы раслі і каб кветкі цвілі,
Каб людзі шчасліва жылі на зямлі.

- Такім чынам, назоўнікі скланяюцца. А што называецца скланеннем назоўніка?
- Назоўнікі, якія не хочаць скланяцца, называюцца <u>непакорлівымі.</u> Яны, можа, і хацелі б, але не могуць, бо госці ў нашай мове, у іх іншыя звычаі. Назавіце іх, прывядзіце прыклады.

**Заданне 6**. Гутарка з класам (*настаўнік звяртаецца да класа*).

- Што абазначаюць назоўнікі кацяня, кураня, цяля, качаня? (*Назвы маладых істот.*)
- Да якіх назоўнікаў паводле скланення яны адносяцца? Чаму?
- Якія назоўнікі адносяцца да рознаскланяльных?

**Псіхалагічны эцюд "Снегапад".**

Выйдзем з-за парт. Заплюшчым вочы і ўявім снегапад. Сняжынкі падаюць зверху, падставім ім свае тварыкі. Падымем рукі і падставім свае далоні. Снег гусцее, гусцее. Памахаем рукамі, разгонім сняжынкі. Падзьміце на сняжынкі, пагрэйце шчокі, апусціце рукі. Вось і сонейка выглянула. Усміхніцеся яму. Усім хораша.

- Паглядзіці на дошку, якое ласкавае сонейка свеціць над краінай "Назоўнік" (*на дошцы – сонейка з праменнямі*). Яго прамяні дакранаюцца да нас ласкава і пяшчотна. Але гэта не зусім звычайныя прамяні. Яны дапамогуць вам не памыліцца пры марфалагічным разборы назоўніка.

**Заданне 7.** На дошцы напісаны верш Ю. Свірка "Шчасце".

Пра шчасце ў дзяўчынкі спыталі.
"Дзе шчасце?" – спыталі ў яе.
- А шчасце – блакітная далеч,
А шчасце – што птушка пяе,
А шчасце – пабегчы сцяжынкай,
Дзе сінню цвітуць васількі,

Лічыць на далонях даждынкі,
І плесці над рэчкай вянкі.

- Якую яшчэ назву верша вы можаце прывесці?
- Зачытайце радкі, у якіх дзяўчынка адказвае на пытанні пра шчасце.
- Як вы разумееце слова "шчасце"?
- Ці лічыце вы сябе шчаслівым?

1. Зрабіць марфалагічны разбор назоўніка "Пра шчасце" (*адзін вучань выконвае на доўшцы*).
2. Выпісаць назоўнікі 3-га скланення ў пачатковай форме, утварыць і запісаць з імі словазлучэнні, паставіўшы іх у форме Р., Д., Т. і М. склонах.
3. Творчае заданне. Напісаць сачыненне - разважанне на тэму: "У чым яно шчасце" ці скласці лінгвістычную казку на тэму: "Назоўнік", або стварыць партрэт назоўніка.

**III. Падвядзенне вынікаў урока.**

Вось і надышла хвіліна
Развітацца нам з краінай
Незвычайнай і чароўнай.
Шлях закончыўся вандроўны.
Хай над ёю сонца грае
І гучаць над родным краем
Дарагія ўсім нам словы:
Мір, здароўе, мама, мова,
Кніга, родныя мясціны,
Клас, Айчына і Радзіма.

**IV. Рэфлексія:**

- Ці змаглі мы справіцца з задачамі ўрока?
- Які настрой панаваў на ўроку?
- Ці спадабаўся вам урок?

**V. Дамашняе заданне:** дапісаць сачыненне – мініяцюру.